The Byelorussian Times

ЧАС
Двумоўны беларускі
часапіс у З.Ш.А.

NO.32, Vol.6, USPS 345-170 July 1981 9-06 Parsons Blvd., Flushing, N.Y. 11357 Price $1.35

THE NAME 'BYELORUSSIA' and Attempts to Change It

Some Groups Propose Changing it to 'Bielarus'
Others Urge a Return to the Historical Name 'Litva'

When in 1772 Moscow had succeeded in forcibly annexing the eastern part of the Kingdom of Litva, it called that part "Byelorussian District" and simultaneously and fictitiously applied the name Litva(Lithuania) to Zhamoyc, a small principality on the Baltic Sea. The newly-introduced name "Byelorussia" gained acceptance only gradually even under the yoke of Russian tyranny. The present-day Byelorussia was popularly called Litva up to the 20-th century and in in some instances even later.

In addition to the name Byelorussia, Moscow had introduced several other names each containing the word "Russia" with a prefix indicating a color or size as, for example, Red Russia, Black Russia, Great Russia, Small Russia, etc. Of these only the name Byelorussia is still in popular use and the so-called Byelorussians are not satisfied with that name. The desire to change the alien-imposed name is strong within the Byelorussian communities and a movement is developing in that direction. The feeling among some people that an emigre community is in no position to change the name of a nation has some merit, but this should not be a decisive factor and in any case if the change is to reclaim a historical name which never should have been changed in the first place, then such a change already has a broad basis of support among the people.

Firstly, there are those who, while not satisfied with the name Byelorussia, do not wish to have it changed at this time because Byelorussia exists today under this name and under this name is a member of the United Nations. These essentially are the only arguments presented by this group which is slowly losing its adherents.

There are those who already have changed the name. This group is located mainly in the Chicago area and uses the name "Bielarus" instead of "Byelorussia". While this is only a change of spelling, in the English language the name "Bielarus" appears to be very different from "Byelorussia" and loses its connection with the word "Russia".

Still others urge a more fundamental change and a return to the historical name "Litva". This group is the most vocal and has the most persuasive arguments. They contend that Byelorussian self-respect demands that this alien-imposed name whose only function was and is to russify Byelorussia, must be abandoned. They further argue, that our nation was known as Litva for more than seven centuries, as thousands of our and foreign documents attest to that fact, and that if we ourselves do not use our historical name, then we will be guilty of wilfully hiding from the world and ourselves these seven centuries of our proud existence as a nation, an act which would be reprehensible.

A well-known proponent of the name Litva, Professor Jan Stankievic, introduced the name "Greatlitva" partly on historical grounds since ethnographical Byelorussia was the only part of the Kingdom of Litva which was Litva proper and for this reason was often called "Great", and partly because today the Zhamoycians erroneously call themselves "Lithuanians" in accordance with Russian propoganda. Prof. Jan Stankievic attempted to popularize the name "Gteatlitva" in the numerous publications which he edited or published.

Dr. Peter Markouski is another advocate of the name Litva which he uses in the form "Vialitva" (meaning Great Litva) in his periodicals.

It seems to us that Byelorussians need not apologize to anyone for their name Litva and the proud history associated with it and no purpose can be served by adding prefixes to Litva even if that prefix is "Great". While Zhamoycians (Soviet Lithuanians) may call themselves by whatever name they choose, they will not be able to deceive history with their Russian-inspired and presently deliberate misrepresentation of their own heritage.

The following quote from the *Litouski Statut*, the 16-th century Code of Laws of the Kingdom of Litva, clearly shows that Zhamoyc (today's Soviet Lithuania) and Rus (part of Ukraine) were Byelorussian that is Litva's possessions and were not even considered to be part of Litva: **"We the liege lord of all our subjects of the Kingdom of Litva and of lands belonging to it, Rus, Zhamoyc and others ...."** (edited from page 141).

Only ethnographical Byelorussia was historical Litva and Litva is still our right and proper name today.

CHURCH LITTIGATION

NEW YORK COURT BARS SECESSIONISTS' TRANSFER OF ST. CYRIL'S TO MIKALAY

In a decision published on August 18, 1981, on the front page of the *New York Law Journal*, the New York State Supreme Court, in an opinion written by Justice Gerald Adler, prohibited dissident members of St.Cyril's Parish of the Byelorussian Autocephalic Orthodox Church (BAOC) in Brooklyn from transferring the Church to Archbishop Mikalay.

Firstly, the court briefly noted the background of the litigation:

"Under the New York State statute, St. Cyril's is subject to the jurisdiction and authority of the American Diocese and its governing bishop. The central dispute in these actions is the attempt by a faction of parishioners at St. Cyril's, led by Alexander Mickievic and Vladimir Rusak, to transfer the parish out of the American Diocese of which Metropolitan Andrew is the governing bishop into another diocese under the control of Archbishop Mikalay. At the annual meeting the parishioners of St. Cyril's held on March 22, 1981 a majority voted to ratify a resolution requesting Archbishop Mikalay to take over the parish. On March 30, 1981 the Governing Bishop Metropolitan Andrew declared the entire meeting of March 22 to be null and void, thus nullifying the aforesaid resolution adopted at the meeting along with the election of new parish board including Alexander Mickievic as chairman and Vladimir Rusak as treasurer. Metropolitan Andrew also issued Archpastoral Orders excommunicating Messrs. Rusak and Mickievic from BAOC.

A schism has thus developed at St. Cyril's, resulting in the underlying actions and the instant motions. Before proceeding to a consideration of these motions, the principles of law governing such a division within the Church and the right of some of the parishioners to transfer St. Cyril's into another diocese must be set forth."

MAJORITY OF PARISHIONERS IRRELEVANT

Then the Court proceeded to consider the principles of law from federal and state decisions and found that courts will adjudge control and use of property to that faction, however small it may be, which adheres to the tenets and doctrine of the religious polity existing at the time the property was acquired. As the court observed:

"The fact that a majority of the congregation may be seeking the change is irrelevant.

"In the case of a schism, the courts will adjudge the property to the members, however few in numbers they may be, who adhere to the form of church government, or acknowledge the church connection, for which the property was acquired. The majority of the members of a parish in a hierarchial structured church cannot abandon the tenets and doctrine of the denomination and retain the right to use the church property, since as secessionists they forfeit all right to the property. If a single member adheres to the original faith and doctrine of the church, then any members of the church association fewer than the whole may not divert it therefrom. (citations omitted) (Russian Church of Our Lady of Kazan v. Dunkel, 67 Misc. 2d 1032, 1054, aff'd 41 AD 2d 746, aff'd 33 NY 2d 456)."

Justice Adler found that "New York has expressly disavowed the use of majority representation to resolve a schism in a hierarchical church."

Upon the above principles the court concluded:

"This court must therefore conclude under the guiding principles set forth above that the faction of the St. Cyril's which remains loyal to the American Diocese and its head bishop Metropolitan Andrew, the governing church body into which the parish was incorporated (RCL section 336), is entitled to the use and control of the Church and its property, and the opposing faction led by Messrs. Mickievic and Rusak has no right to said use and control of St. Cyril's. The following motions shall be decided in accordance with this conclusion."

CONTROL OF BANK ACCOUNT

The court then went on to determine control of St. Cyril's bank account. Apparently the dissidents had commenced two actions against the depository of the Church account, European American Bank and Trust Company and the defendants in these actions, that is the faction remaining loyal to the Metropolitan Andrew, for the following relief:

(1) "to order a transfer of control from the defendants to plaintiffs over (the bank account) and

(2) "directing the European American Bank and Trust Company to accept the officers elected at the annual meeting of March 22, 1981, including Messrs. Mickievic and Rusak as the persons qualified to control the subject bank account."

The court determined:

"These two motions are each denied and a temporary restraining order issued against the defendants in conjunction herewith is vacated. As the court has concluded above, the use and control of the property of St. Cyril's Church shall remain in the hands of the faction which seeks to remain loyal to the American Diocese under the auspices of Metropolitan Andrew and shall not be transferred to the Mickievic/Rusak faction."

In addition, the court granted the loyalist faction's motion to dismiss the dissidents' complaint:

"In view of the actions taken by the Governing Bishop of the Church, Metropolitan Andrew, in removing plaintiff Mickievic as Chairman of the Board of Trustees of St. Cyril's, in anulling his subsequent election as Chairman and excommunicating him from the BAOC, Mickievic lacks capacity to bring this action on behalf of St. Cyril's."

Finally, the court granted a preliminary injunction enjoining the dissidents from interfering with religious services at St. Cyril's.

CAPTIVE NATIONS WEEK, 1981

A PROCLAMATION
by the President of the United States of America

Twenty-two years ago, by a joint resolution approved July 17, 1959 (73 Stat. 212), the Congress authorized and requested the President to proclaim the third week in July as Captive Nations Week.

Last January 20 saw again a change in Administration under our Constitution, the oldest written document of its type in continuous force in the world. The peaceful and orderly transfer of power in response to the sovereign will of our people is sometimes taken for granted by Americans. Yet events in some other areas of the world should remind us all of the vital, revolutionary ideal of our Founding Fathers: that governments derive their legitimacy from the consent of the peoples they govern.

During Captive Nations Week, Americans should realize our devotion to the ideal of government by consent, a devotion that is shared by millions who live in nations dominated today by a foreign military power and an alien Marxist-Leninist ideology.

This week Americans should recall the series of historical tragedies — beginning with the broken promises of the Yalta Conference — that led to the denial of the most elementary forms of personal freedom and human dignity to millions in Eastern Europe and Asia.

In recent years, we have seen successful attempts to extend this oppression to Africa. Latin America and Asia — most recently in the brutal suppression of national sovereignty in Afghanistan and attempts to intimidate Poland.

During Captive Nations Week, we Americans must reaffirm our own tradition of self-rule and extend to the peoples of the Captive Nations a message of hope — hope founded in our belief that free men and women will ultimately prevail over those who deny individual rights and preach the supremacy of the state; hope in our conviction that the human spirit will ultimately triumph over the cult of the state.

While we can be justly proud of a government that is responsive to our people, we cannot be complacent. Captive Nations Week provides us with an opportunity to reaffirm publicly our commitment to the ideals of freedom and by so doing maintain a beacon of hope for oppressed peoples everywhere.

Now, therefore, I, Ronald Reagan, President of the United States of America, do hereby designate the week beginning on July 19, 1981, as Captive Nations Week.

I invite the people of the United States to observe this week with appropriate ceremonies and activities and to reaffirm their dedication to the ideals which unite us and inspire others.

In witness whereof, I have hereunto set my hand this thirtieth day of June, in the year of our Lord nineteen hundred and eighty-one and in the Independence of the United States of America the two hundred and fifth.

— Ronald Reagan

EDITOR'S NOTE: This Proclamation by President Reagan is a vast improvement over the Captive Nations Week Proclamations issued by President Carter in the past. Still one could have expected more from President Reagan. President Reagan apparently ignored the demand by the National Republican Heritage Groups Council, as expressed at its Convention last June, that the President issue a Captive Nations Week Proclamation "in the language originally adopted" in 1959 which called for the return to the status of freedom of all Captive Nations and listed them by name. There is also no indication that President Reagan realizes that Russian imperialism and not Communist ideology is the main oppressor in Eastern Europe.

Ад РЭДАКЦЫІ

Прадаюцца гадавікі газэты *Беларускі ЧАС*. Цана аднаго гадавіка, уключаючы перасылку, 10 амэрыканскіх даляраў.

Просім зьвяртацца ў гэтай справе да рэдакцыі.

From pages of Byelorussian history...



The above map represents Byelorussia, formerly called Litva, and its possessions in 1464. The map is reproduced from the "Atlas of History of the USSR", part 1, published in Moscow in 1959, with inscriptions changed to English and with the Byelorussian Ethnographical Boundary superimposed according to Professor Jan Stankievic. Territory within the Byelorussian Ethnographical Boundary represents Litva proper and areas outside of that boundary were Byelorussian (Litva's) possessions. These possessions included (1) Zhamoyc, which today, according to Russian propoganda is erroneously called the "Lithuanian Soviet Socialist Republic" or simply "Lithuania" and (2) Rus, a major part of today's Ukraine.

In general, the map agrees with the map of Prof. Jan Stankievic which was published in the *Byelorussian Times*, No.25–26, 1980. It should however be noted that the Soviet authors had chosen to represent Byelorussia in 1464, the year when Moscow had temporarily succeeded in subjugating the Byelorussian Province of Pskou and the surrounding territories on the northern frontier. No doubt this was done deliberately by the authors to cast Moscow in a more favorable light.

On the other hand, this Soviet map shows much more clearly than Prof. Stankievic's map the intimate relationship between Zhamoyc, the so-called "Lithuania", and the Teutonic Order. Zhamoyc was located in the heart of the territory claimed by the Teutonic Order and for that reason Zhamoyc often changed hands between Byelorussia and the Teutonic Order. Zhamoyc was a Byelorussian possession, but was regarded by Byelorussia as an "extra piece" for use in bargaining with the Teutonic Order. It was only in 1411, after the decisive defeat of the Teutonic Order at Grunwald by Byelorussian armies with the help of the Poles, that Zhamoyc was permanently annexed to Byelorussia.

As the map indicates, Byelorussia (formerly called Litva) had possessions on nearly all her frontiers and was a serious contender for hegemony over all Eastern Europe, a position which she later lost to Moscow.

У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

З прычыны летніх вакацыяў гэты нумар газэты выйшаў у скарачэньні й публікацыя наступных артыкулаў была адложана да наступнага нумару:

(1) *Сьвятач Вечнай Прыгожасьці*, част.2, Праф. К. Тарасевіч
(2) З Архіву БАПЦ...
(3) *Аб Космасе*, папулярны нарыс.
(4) Рэцэнзыя на *Службоўнік* Уладыкі Мікалая
(5) З жыцьця Беларусаў у Вялікай Брытаніі

У Царкоўнай Справе ў Брукліне
СУД ПРЫЗНАЎ ПОЎНУЮ ЎЛАДУ МІТРАПАЛІТА

ЗАБАРАНІЎ ПЕРАВОД ПАРАФІІ СЬВ. КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА ДА ЎЛАДЫКІ МІКАЛАЯ
РАШЫЎ ШТО ЖАДАНЬНІ БАЛЬШЫНІ ПАРАФІЯНАЎ НЯ МАЮЦЬ ЗНАЧЭНЬНЯ

10-га жнівеня 1981 г., Вярхоўны Суд у Брукліне, Ню Ёркк, вынес пастанову ў справе закалоту ў Парафіі Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне. Гэтая справа складалася з шасьці асобных справаў якія суд палучыў разам з практычных меркаваньняў.

18-га жніўня 1981 г., пастанова суду была надрукаваная ў Ню Ёрскай адвакацкай газэце *New York Law Journal*, на першай бачынцы, зьверху на мейсцы дзе друкуюцца толькі самыя важныя й цікавыя судовыя пастановы.

У сваёй апініі суд піша, што галоўны аспэкт гэтай справы „была спроба групы парафіянаў Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага, пад кіраўніцтвам Аляксандра Міцкевіча й Уладзімера Русака, перавесьці Прыход із Амэрыканскай Епархіі, якою кіруе Мітрапаліт Андрэй, у іншую Епархію пад кантроляй Архіяпіскапа Мікалая". Пасьля даволі дэтальнага апісаньня падзеяў закалоту, суд прыступіў да вырашэньня справы.

Называючы падзеі закалоту ў БАПЦ „схізмам", суд забараніў удзельнікам схізму, ці адшчэпнікам, умешывацца ў кіраўніцтва Парафіі. Падаючы прыклады з іншых царкоўных судоў і агульныя прынцыпы на падставе якіх суды рашаюць царкоўныя справы, суд пастанавіў, што група Міцкевіча й Русака „як адшчэпнікаў, пазбаўляецца ўсіх правоў да маёмасьці".

Далей, суд павярнуў кантролю банкавага конта групе якая засталася лаяльнай да Мітрапаліта Андрэя. У справе Міцкевіча, які рэпрэзэнтуе адшчэпнікаў каторыя стараліся перабраць сабе кантролю гэтага конта, пачаўшы судовую справу (адну з шасьці) і, дзеля якой банкавае конта было замарожанае, суд прысудзіў: „Гледзячы на тое, што Кіруючы Япіскап, Мітрапаліт Андрэй, зьняў Міцкевіча са старшынства Парафіяльнае Рады, уняважніў парафіяльны сход на якім Міцкавіч ізноў быў выбраны на старшыню Парафіяльнае Рады й урэшце экскамунікаваў яго, Міцкевіч ня мае ніякай падставы распачынаць суд ад імя Парафіі Сьв. Кірылы Тураўскага."

У справе папулярызаванай адшчэпнікамі, так-званага „жаданьня бальшыні" перайсьці да Архіяпіскапа Мікалая, суд пастанавіў: „Той факт, што бальшыня парафіянаў можа хацець зьмены, ня мае ніякага значаньня". У дадатак да гэтага, цэлы сход на якім была прынятая рэзалюцыя аб „пераходзе да Мікалая" быў уневажнены Мітрапалітам і гэтае ўневажненьне было пацьверджанае судом.

У справе закалоту ў Брукліне й у падобных папярэдніх судовых справах, суд пакінуў поўную ўладу па боку Кіруючага Япіскапа. Гэта значыць, што суд ня толькі пацьвердзіў, але й практычна гатовы выканаць, сілаю калі трэба будзе, пастановы Мітрапаліта Андрэя.

КАРОТКІ ЖЫЦЬЦЯПІС МІТРАПАЛІТА АНДРЭЯ

З нагоды 80-ці годняга Юбілею Мітрапаліта Андрэя, Першагерарха БАПЦ, ніжэй друкуецца Яговы жыцьцяпіс.

* * *

Дня 3-га ліпеня сёлета Мітрапаліту Андрэю споўнілася 80 год жыцьця. Нарадзіўся Ўладыка Андрэй (Аляксандар Крыт) у невялікай вёсцы Мархачоўшчына Стаўпецкага павету, у сялянскай сямьі. Бацькі Пётра й Тэкля былі вельмі пабожнымі, а таму стараліся прышчапіць рэлігійны культ і сваім дзецям.

У тым часе школы ў вёсцы ня было, а таму навуку малы Аляксандар распачаў у нанятых „дырэктароў" і школа пачарзе пераходзіла разам з „дырэктарам" з хаты ў хату.

Пасьля двух год такога навучаньня ў вёсцы была адчынена земская пачатковая школа, якую з добрымі вынікамі скончыў Аляксандар і прадаўжаў навуку ў двухклясовай Міністэрскай школе ў Новым Сьвержні.

З прычыны вайны, якая выбухла ў 1914 годзе, напачатку навучэньне ў школах было спынена, а потым адбывалася ненармальна. Але сьвет не без добрых людзей. У Менску ў 1917 г. арганізоўваецца Ўрад БНР. А ў Новым Сьвержні пад кіраўніцтвам навукоўца Ніканора Ярашэвіча й групы актывістаў адчыняецца гімназія ў якой і прадоўжвае сваю навуку сучасны Мітрапаліт Андрэй, а па заканчэньні 5 клясаў прагімназіі ў Новым Сьвержню перяжджае ў Нясьвіж і прадаўжае навуку. Гімназію канчае й дастае дыплём сьпеласьці ў 1924 годзе.

Ня маючы магчымасьці атрымаць вышэйшую асьвету ў Польшчы з прычыны нястачы сьродкаў, а жадаючы прадаўжаць навуку, Ўладыка звярочваецца ў Прагу Чэскую да свайго былога настаўніка Ігара Малішэўскага з прозьбай аб прыезьдзе ў Чэхію. Адказ атрымаў вельмі задавальняючы: „Прыяжджайце, залічу Вас на любы факультэт. Па маею рэкамандацыі зможаце атрымаць дапамогу аднак павінны разьлічаць і на свае сьродкі ў суме 16 даляраў на месяц."

Выязд у Прагу не адбыўся з прычыны нястачы сьродкаў, а таксама й з перашкодаю атрымаць дазвол на выезд, бо ў тым часе ўжо распачалася арганізацыя Таварыства Беларускае школы й арганізацыя Грамады, а разам з гэтым і прасьлядаваньне актыўных супрацоўнікаў беларускіх арганізацыяў.

У 1927 г. у Радашковічах захадамі Таварыства Беларускае Школы адчынены настаўніцкія курсы для падрыхтоўкі настаўнікаў для маючых адчыніцца Беларускіх Школаў, на якія быў прыняты й сучасны Ўладыка. Гэта было першае ягонае спатканьне з дзеячамі беларускае культуры бо на курсах выкладалі наступныя настаўнікі Радашкоўскай гімназіі: Стацкевіч, Кароль, Гаўрылік, Браніслаў Тарашкевіч, Радаслаў Астроўскі, Багаслаў Паўловіч, і санатар Уласаў. З Вільні наведвалі час ад часу Ігнат Дварчанін, Рак-Міхайлоўскі, Валошын, рэдактар „Маланкі" Маразовіч і другія зь якімі навязалася далейшае супрацоўніцтва ў беларускім адраджэнскім руху.

Беларускіх школаў, як ведама, адчыніць польскі ўрад не дазволіў, а таму прышлося шукаць працы ў нова адчыненай Англо-Эўрапэйскай фірме ў Новым Сьвержні. Там была нагода пазнаёміцца з немцамі якія пераехалі як спэцыялісты для адпраўкі досак заграніцу. Знаёмства, супрацоўніцтва зь імі й жаданьне прадаўжаць навуку выклікала жаданьне ехаць у Нямеччыну й аб гэтым была напісаная просьба аб прыняцьці ў Палітэхніку ў Бэрліне. Да Палітэхнікі быў прыняты, аднак легальным спосабам выехаць да Нямеччыны ня было магчымасьці, а таму ў Нямеччыну адбыўся выязд толькі праз Латвію.

У Бэрліне ў тым часе з ведамых беларусаў можна было толькі спаткаць былога Консула Беларускага Ўраду, Андрэя Бароўскага й студэнта Анатоля Шкутко.

У 1939 г. распачалася вайна з Польшчаю. З першых яе дзён у нямецкім палоне апынулася тысячы палонных, якія маглі быць зволынены з лягероў на цывільную працу. Трэба было выдаваць для палонных Беларусаў газэту й гэта ўсё легла на плечы пару асобаў у Бэрліне. За выдавецтва газэты „Раніца" прышлося брацца ня маючы нават да гэтага падрыхтоўкі, аднак яна выдавалася.

Пасьля капітуляцыі Нямеччыны быў зарганізаваны для Беларусаў лягер у Ватэнштэце й у ім беларуская гімназія дзе, будучы Ўладыка, быў настаўнікам, выкладаючы матэматыку й геаграфію.

На працу ў Англію выехаў Аляксандар у 1948 г. дзе адразу ўключыўся ў грамадзка-беларускую працу сярод беларускіх вайскоўцаў, якія былі зарганізаваныя ў Згуртаваньне Беларусаў Вялікай Брытаніі.

У 1950 г. ў Англію прыяжджае Япіскап БАПЦ Васіль і рукапалагае Аляксандра ў сьвятары й дзякуючы падтрымцы сьведамых беларускіх вайскоўцаў арганізацыя беларускага рэлігійнага жыцьця хутка пашыраецца на ўсю Англію. У Брадфорд быў набыты адказны дом, дзе была ўладжана капліца й адбываліся Багаслужбы. Зарганізавана рэлігійнае жыцьцё ў беларускіх асяродках у Манчэстар, Лёндане, Кэмбрыдж і Бірмінгам. Навязалася лучнасьць з Ангельскаю Царквою ў Брадфорд і Манчэстар, заложаны суботнія школы і адбываліся рэлігійныя зьезды, а для каардынацыі працы была выбраная Вікарыяльная Ўправа.

Напачатку 1961 году а. Аляксандру з сумам прышлося разьвітацца з добра сьведамымі вернікамі ў Англіі й выехаць у Амэрыку, бо там ня было сьвятара й існавала сярод вернікаў бязладзьдзе. У Англіі рэлігійным жыцьцём заапякаваўся а. Я. Абабурка і яно праводзіцца нармальным парадкам.

Лучнасьць а. Аляксандра з дарагімі вернікамі ў Англіі аднак не спынілася. У 1972 г. Ўладыка Андрэй ужо як Архіяпіскап БАПЦ ізноў наведаў Англію й рукапалажыў на сьвятара а. Яна Пекарскага, адведаў усе беларускія асяродкі ў Англіі, ды ў пропаведзях і прыватных гутарках натхняў вернікаў, каб набылі сваю царкву. На заклік Уладыкі Андрэя вернікі адгукнуліся й царква была набытая ў Манчэстары.

Хіратонія Ўладыкі Андрэя ў сан Япіскапа ў 1968 г. была як бы прарочаю для далейшага існаваньня БАПЦ на чужыне. Прарочаю таму, што ў 1970 г. адыходзіць у вечнасьць Адміністратар БАПЦ на Амэрыку сьв. памяці Ўладыка Васіль, а ў 1972 г. памірае аднаўленец БАПЦ Архіяпіскап Сяргей. Таму Ўладыку Андрэю было суджана абняць кіраўніцтва БАПЦ на Чужыне й дзейнасьць Ўладыкі Андрэя на працягу ягонага кіраўніцтва зус ім сябе апраўдала ўва ўсіх галінах рэлігійнага жыцьця Беларускае Царквы на Чужыне.

Усе перашкоды былі перамажаны й Царква ўмацавалася арганізацыйна, бо Ўладыка Андрэй не пабаяўся ўзяць на сябе цяжкога ярма й таму была абвешчана ў 1972 годзе Мітраполія Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы на Чужыне, ад імя якое распачалася лучнасьць у форме прывітаньняў з Праваслаўнымі Патрыярхамі й кіраўнікамі другіх Праваслаўных Цэркваў.

Памыснае разьвіцьцё БАПЦ, яе значаньне й пашырэньне веды аб ёй сярод усіх народаў па ўсім сьвеце ўзьвялічае ейнае імя сярод іншых народаў і з дапамогаю Сілы Божае ўсе дывэрсыйныя сілы накіраваныя супраць Царквы паволі ліквідуюцца.

Уладыка Андрэй распачаў сваю сьвятарскую службу тут у Брадфардзе з пасярод нас, і быў першым настаяцелям БАПЦ на Вялікую Брытанію.

(працяг на 6-й бачынцы)

У 80-ю Гадаўшчыну Нараджэньня Ўладыкі Мітрапаліта Андрэя

Дня 3-га ліпеня 1981 году споўнілася 80 год з дня нараджаньня Ўладыкі Мітрапаліта Андрэя, Першагерарха Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы й гэты Юбілей быў шырака адзначаны па ўсяму вольнаму сьвету ў прыходах БАПЦарквы.

З гэтае нагоды ў нядзелю 5-га ліпеня Прэасьвяшчэнны Ўладыка Ізяслаў і Высокадастойны Мітрафорны Пратаярэй а. Карп Стар у Катэдральным Саборы Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне, адправілі Архірэйскую Літургію й Малебен з мнагалецьцем, просячы ў Бога каб паслаў для Ўладыкі Мітрапаліта паўнату духовых і фізычных сілаў.

* * *

У Кліўлендзе ў Саборы Жыровіцкае Божае Маці Сьв. Літургію й Малебен адправіў сам Юбілянт.

* * *

У Брадфорд, Англія, Сьв. Літургію й Малебен адправіў Мітрафорны Пратаярэй а. Ян Абабурка. Пасьля Багаслужбы, дзякуючы ініцыятыве сяброў Парафіяльнае Рады быў зарганізаваны ў пашану Юбілянта Абед Удзячнасьці й быў прачытаны прынагодны рэфэрат аб рэлігійнай дзейнасьці Ўладыкі Андрэя ў Англіі.

* * *

Сьв. Літургіі й Малебены за здароўе Юбілянта былі адпраўлены: у Парафіі Сьв. Антона, Яна й Еўстафа ў Мэльбурн-Пратапр, а. Аляксандрам Кулакоўскім; у Парафіях у Кэмбрыдж, Лёндан і Бірмінгам-Вульвэргамтон, Прат. Янам Пекарскім; у Адэляйдзе, а. Аўгенам Сітнікам; і ў Дэтройце, а. Максімам Таўпека.

АТРЫМАНЫЯ ПРЫВІТАНЬНІ
Наступнага Зьместу

Ваша Блажэнства Дарагі Ўладыка!

У дзень 80-ці лецьця Вашага нараджэньня просім прыняць нашыя найшчырэйшыя прывітаньні з найсардэчнейшымі пажаданьнямі моцы духа й вытрываласьці.

Мы молім Госпада Бога, каб узмоцніў Вашыя духовыя сілы да далейшай самаахвярнай працы для дабра нашае Сьв. БАПЦарквы й Беларускага Народу!

Многія Лета! Іспола Эті Дэспота!

3 ліпня 1981 г. *+ Япіскап Ізяслаў*
— Протапр. а. Васіль Кендыш

* * *

Дарагі Ўладыка Мітрапаліт!

Вітаем Вас з Днём 80-ці годзьдзя нараджэньня. Жадаем ад Госпада Бога для Вас сілаў і здароўя цьвёрда трымаць стырно Царкоўнага Параплаву ў забушаваным жыцьцёвым моры. Няхай Госпад узмоцніць Вашыя сілы!

— Мітр. Пратаярэй Карп Стар і 12 подпісаў
Парафія Сьв. Тройцы ў Дораты

* * *

Тэлеграма з Мэльбурну, Аўстралія.
Мітрапаліту Андрэю ў Кліўлендзе!

Парафія ў Мэльбурне вітае Ваша Блажэнства з днём 80-ці годзьдзям нараджэньня й з 31-мі ўгодкамі пастырскае службы ля Сьв. Алтара БАПЦ. Мы просім Госпада Бога каб паслаў Вам добрае здароўе й здольнасьць кіраваць БАПЦарквою. Многія Лета Ўладыка!

— Протапр. а. Аляксандар Кулакоўскі
Настаяцель Парафіі ў Мэльбурн

* * *

Пятага ліпеня а гадзіне 8-й раніцы тэлефанічна атрыманы шчырыя пажаданьні ад Настаяцеля Парафіі Сьв. Апосталаў Пятра й Паўла ў Адэлайдзе, Аўстраліі, а. Аўгена Сітніка.

* * *

Ад Настаяцеля БАПЦарквы ў Вялікай Брытаніі ў Манчэстары атрыманае прывітаньне наступнага зьместу:

Блажэнны Ўладыка!

Вітаю Вас з 80-мі ўгодкамі Вашага жыцьця й з 31-мі ўгодкамі Вашай Архіпастырскай працы ў Сьвятой БАПЦ.

Вы Блажэнны Ўладыка, ахвярна й няўтомна выконвалі прыняты на Сябе абавязак. Хай Міласэрдны Бог і надалей асяняе Вас Сваёю Ласкаю й дапамагае Вам у Архіпастыпскай працы для дабра Сьвятое БАПЦарквы й Беларускага Народу.

Ваш шчыры слуга ў любові Хрыстовай,
— Мітрафлоны Прат. Ян Абабурко

* * *

ПАРАФІЯ РАСТВА ПРАСЬВЯТОЕ БАГАРОДЗІЦЫ Ў КЭМБРЫДЖ

Ваша Блажэнства, Блажэньнейшы Ўладыка!

Вітаем Вашае Блажэнства з 80-ці лецьцем дня нараджэньня й 31 гадавінаю Вашае цяжкое самаахвярнае працы ля Сьв. Прыстолу БАПЦ. Жадаем Вам усяго найлепшага й просім Бога каб паслаў Вам добрае здароўе й узмоцніў сілы на Многія Лета для далейшага служэньня ў Вінаградніку Хрыстовым на славу Богу на карысьць Бацькаўшчыне Беларусі, Сьв. БАПЦаркве й на радасьць усім нам.

— Прат. а. Ян Пекарскі, Старшыня
Я. Гралеўскі, Сакратар
В. Няслухоўскі й уласнаручныя подпісы 17 вернікаў. 21 чэрвеня 1981 г.

* * *

ПАРАФІЯ ЎСІХ СЬВЯТЫХ У ЛЁНДАНЕ

Ваша Блажэнства, Блажэньнейшы Ўладыка!

Вітаем Ваша Блажэнства з 80-ці лецьцем Вашага нараджэньня й Юбілеям 31 год цяжкое самаахвярнае працы ў Вінаградніку Хрыстовым і просім Усемагутнага Госпада Бога, каб паслаў Вам добрае здароўе і ўзмоцніў сілы на доўгія гады для далейшае працы на славу Богу й на карысьць шматпакутнае Бацькаўшчыны Беларусі й Сьвятое БАПЦарквы.

— Прат. а. Ян Пекарскі, Настаяцель
П. Наваро, Старшыня й А. Зданковіч, Сакратар
Парафіяльнае Рады БАПЦ ў Лёндане

* * *

ПАРАФІЯ ЖЫРОВІЦКАЕ БОЖАЕ МАЦІ БАПЦ Ў БІРМІНГАМ-ВУЛЬВЭРГАМТОН

Ваша Блажэнства, Блажэньнейшы Ўладыка!

Вітаем з 80-ці годзьдзям Вашага нараджэньня й 31 годам Вашае цяжкое самаахвярнае працы, выконваючы яе ў вельмі скромным асабістым жыцьці й просім Усемагутнага Бога, каб паслаў Вам добрае здароўе і ўзмоцніў сілы для далейшае працы ў Вінаградніку Хрыстовым на славу Богу на карысьць нашае паняволенае Бацькаўшчыны, Сьв. БАПЦарквы й на дабро й радасьць усім нам.

З пашанай,

— Прат. Ян Пекарскі, Настаяцель Парафіі
М. Баяроўскі, Старшыня, Я. Міхальчык, Сакратар
і ўласнаручныя подпісы 8 парафіянаў
8.6.1981 г.

* * *

Настаяцель Парафіі Сьв. Духа ў Дэтройт вітае Ўладыку Андрэя наступнымі словамі: „У дзень Васьмідзесяці годзьдзя Вашага жыцьця перасылаю мае найшчырэйшыя пажаданьні шчасьця, добрага здароўя, пасьпеху ў рэлігійнай і нацыянальнай працы на доўгія гады ў ачольванай Вамі нашай Царкве! Сто Год!!!"

— Пакорны а. Максім Таўпека

* * *

ПАРАФІЯЛЬНАЯ РАДА ЦАРКВЫ СЬВ. СПАСА Ў БРАДФОРД

Найпачэсьнейшаму Ўладыку Мітрапаліту Андрэю Першагерарху БАПЦарквы

Найпачэсьнейшы Ўладыка!

Мы вернікі БАПЦарквы, парафіяны Царквы Сьв. Спаса ў Брадфордзе горача вітаем Вас Уладыка з 80-ці годзьдзем народзінаў. Мы яднаемся ў адну супольную малітву, ды просім Усемагутнага, каб паслаў Вам шмат радасьці, здароўя й сілаў, добрых посьпехаў у штодзённай працы, ды захаваў Вас на шматлікія гады.

Мы застаёмся пакорныя Вашыя вернікі! З сардэчным прывітаньнем і шчырым жаданьнем,

— Янка Калбаса
Сакратар Парафіяльнае Рады

* * *

БЕЛАРУСКАЯ НЕЗАЛЕЖНАЯ ДУМКА
Беларусоў Паўночнае Англіі
„ГУРТОК ВАСІЛЬКА"

Найпачэсьнейшаму Мітрапаліту Андрэю Першагерарху БАПЦ на Чужыне

Найпачэсьнейшы Ўладыка!

Ад імя сяброў Беларускае Незалежнае Думкі, Беларусаў Паўночнае Англіі „Гуртка Васілька" ў Брадфордзе, шчыра віншуем Вас з 80-ці годзьдзем Вашага цярністага жыцьця. Жадаем Вам шмат найлепшага, і просім Бога каб дапамагаў у сіле й здароўі, ды захаваў Вас на многія гады!

З прывітаньнем і пашанай да Вас,

— М. Віцэнчык, Вязны „ГВ"
Ліпень 1981

* * *

ЗГУРТАВАНЬНЕ БЕЛАРУСАЎ У ВЯЛІКАБРЫТАНІІ
52 Пэнн Рд., Лёндан, 29.6.1981

Яго Блажэнству
Мітрапаліту Андрэю
Першагерарху БАПЦ

Блажэньнейшы Ўладыка!

Ад імя беларускага грамадзтва ў Вялікабрытаніі з вялікай радасьцю вітаем Вас з 80-мі ўгодкамі з дня нараджэньня й таксама з 31-мі ўгодкамі з дня рукапалажэньня ў сьвятарскі сан. Няхай Усемагутны Бог пашле Вам здароўя, сілаў і вытрываласьці надалей працаваць на карысьць Сьвятой Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы й на дабро нашай Бацькаўшчыны Беларусі.

Астаёмся з вернасьцю й вялікай пашанай да Вас, Уладыка!

— Я. Міхалюк *— П. Наваро*
Старшыня ЗБВБ *Сакратар ЗБВБ*

* * *

Яго Блажэнству
Мітрапаліту Андрэю
Першагерарху БАПЦ

Вашае Блажэнства!

Шчыра вітаем Вас з Вашым Юбілеям — 80 годзьдзем жыцьця плённае працы на ніве Царкоўнай і Нацыянальнай.

Хай Госпад Наш Ісус Хрыстос прыспарыць Вам здароўя каб далей працаваць і змагацца супраць ворагаў і на славу Нашае Сьвятое Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы й нашага паняволенага Беларускага Народу.

Шчасьці Вам Божа,

+Япіскап Ізяслаў

* * *

ПАРАФІЯЛЬНАЯ РАДА САБОРУ СЬВ. КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА Ў БРУКЛІНЕ

Яго Блажэнству
Мітрапаліту Андрэю
Першагерарху БАПЦ

Вашае Блажэнства!

З нагоды Вашага 80-ці Гадовага Юбілею, Парафія Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне вітае Вас, Дарагі Ўладыка, й просіць Усемагутнага Бога каб паслаў Вам фізычную й духовую сілу ў Вашай працы на пасадзе Галоўнакіруючага Герарха ў БАПЦарква.

Шмат год Уладыка!

— У. Курыла
Старшыня Парафіяльнае Рады
Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага

* * *

СЯСТРЫЦТВА САБОРУ СЬВ. КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА Ў БРУКЛІНЕ

Яго Блажэству
Мітрапаліту Андрэю
Першагерарху БАПЦ

Вашае Блажэнства!

Сястрыцтва Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага шчыра вітае Вас Уладыка з 80-ці годзьдзем Вашага жыцьця й 31-м годзьдзем Вашай Пастырскай і Архіпастырскай працы й жадае Вам здароўя й сілы на многія гады каб Вы яшчэ доўга вялі БАПЦ й трымалі яе, як да гэтуль, на моцным рэлігійным і беларуска-нацыянальным грунце даючы адпор усім ейным ворагам.

— З. Гарошка
Старшыня Сястрыцтва
Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага

* * *

ПАРАФІЯ ЖЫРОВІЦКАЕ БОЖАЕ МАЦІ Ў ГАЙЛЭНД ПАРКУ
11 жнівеня 1981

Найпачэсьнейшаму Мітрапаліту Андрэю
Першагерарху БАПЦарквы
Кліўленд, Огаё

Ваша Найпачэсьнейшасьць!

Старшыня, Заступнік Старшыні й Стараста, а таксама Парафіяне Парафіі Жыровіцкае Божае Маці ў Гайлэнд Парк, Н. Джэрзі, складаюць Вам свае найшчырэйшыя пажаданьні з нагоды Вашага 80-ці годзьдзя.

Няхай Усемагутны апякуецца Вамі яшчэ доўгія годы!

— Віктар Лосік
Старшыня Парафіяльнае Рады

* * *

АД КАЗАКАЎ РЭДАКТАРА Й ВЫДАЎЦА ЖУРНАЛУ „КАЗАЧЬЯ ЖИЗНЬ"

Высокапрэасьвяшчэньнейшага Мітрапаліта Андрэя вітаем з 80-ці лецьцем жыцьця й жадаем Вам моцнага здароўя й доўгага жыцьця. Няхай Госпад Бог дазволіць Вам дажыць да часу Незалежнай Беларусі й вярнуцца на сваю Дарагую й Родную Бацькаўшчыну Беларусь.

26 ліпеня 1981
Шчыра Ваш, Ф. Бігдай з Сям'ёю

АСАБІСТЫЯ ПРЫВІТАНЬНІ

З атрыманых асабістых прывітаньняў на асаблівую прыязьнь і шчырасьць заслугоўваюць прывітаньні ад наступных Вельміпаважаных асобаў:

Ад Спадарства Войтэнкаў і Р. Брэндар з Сомерсэт,
Ад Вельмішанаванае Матушкі Войтэнка з Дэтройт,
Ад С-ва Стома Васіля й Ніны з Ню Брунсвік,
Ад Пав. Сп. М. Белямука з Кліўленду,
Ад Сп. А. Лашука з Англіі,
Ад С-ва Косароў з Пэнсылвэніі й шматлікіх якім Юбілянт гэтым складае шчырую падзяку й у малітвах просіць ласкі Божае.
Ад а. Пратапрасьвіцера Аляксандра Радэнковіча із сэрбскага прыходу ў БАПЦ.
Ад С-ва Курылаў з Ню Ёрку.

* * *

ПАДЗЯКА

Усячэснаму Духавенству й Багалюбным Вернікам Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы на Чужыне

Просячы ў малітвах Ласкі Божае для ўсіх, што прывіталі мяне з 80-мі ўгодкамі майго жыцьця й з 31-мі ўгодкамі працы ў Хрыстовым Вінаградніку, я ад шчырага сэрца дзякую ўсім, што ўзнасілі да Ўсемагутнага Бога малітвы за маё здароўе й аб прадаўжэньні майго зямнога жыцьця, а таксама ўсім тым, што прыслалі прывітаньне з нагоды майго Юбілею.

Ня кожнаму сьмяротнаму прызначана пражыць восемдзесят год, а асабліва калі гэтыя гады праходзяць у цяжкім змаганьні за рэлігійна-нацыянальныя правы свайго Народу, а асабліва, калі гэтыя 31 год рэлігійнае дзейнасьці праходзілі падобна параплаву на хваліючым моры.

Ня лёгка было аднаўляць беларускае рэлігійна-нацыянальнае жыцьцё пасьля доўгавяковае ліквідацыі яго нашымі няпрыяцелямі.

Аднак сіла веры Беларускага Народу ў асобах яе рэлігійных змагароў перамагла перашкоды, Царква адноўлена, існуе, чакае новых змагароў і на згуртаваньне ўсіх беларускіх вернікаў каля свае Маткі БАПЦ.

Зь вераю ў дапамогу ў гэтым Найвышэйшае Божае Сілы,

З любоўю ў Хрысьце Ісусе Спасе нашым,

— Мітрапаліт Андрэй —
Першаярарх Б.А.П.Царквы на Чужыне

Яго Блажэнства
МІТРАПАЛІТА АНДРЭЯ
Першагерарха Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы
ВІТАЕ
з 80-ці годзьдзем Ягонага жыцьця
Й ШЧЫРА ЖАДАЕ ДАСТОЙНАМУ ЮБІЛЯРУ
доўгага жыцьця й многа посьпехаў у Ягонай далейшай Архіпастырскай працы
РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ „ЧАС" І СЯМ'Я ГАРОШКАЎ

„ВОЛЯ БАЛЬШЫНІ БЕЗ КАНТРОЛІ ЗАКОНУ ЁСЬЦЬ НЕБЯСЬПЕЧНАЯ РЭЧ БО ЗНОЙДЗЕЦЦА АГІТАТАР ЯКІ ПАВЯДЗЕ ГЭТУЮ БАЛЬШЫНЮ ДА ЗГУБЫ Й ВОЛЯ АГІТАТАРА БУДЗЕ ВОЛЯЮ БАЛЬШЫНІ"

The Byelorussian Times
ЧАС Двумоўная беларуская газэта
USPS 345-170
9-06 Parsons Blvd.
Flushing, N.Y. 11357
U.S.A.
A Byelorussian Newspaper
Published bimonthly in January, March, May, July, September and November.
Dr. Roger Horoshko, Publisher
Annual Subscription
$8 in U.S. currency
$10 Canadian, £6 English
Postmaster:
Send address changes to the BYELORUSSIAN TIMES
Box 141, Whitestone, N.Y. 11357
Second Class Postage Paid at Flushing, N.Y. 11355
„ЧАС"
Двумоўная беларуская газэта
Выходзіць 6 разоў на год у студзені, сакавіку, травені, ліпені, верасьні й лістападзе.
Др. Р. Гарошка, Выдавец
Гадавая Падпіска
8 амэрыканскіх даляраў
10 канадыйскіх даляраў
6 ангельскіх фунтаў

УВАГА!
1) Рэдакцыя не прынімае да друку ананімных артыкулаў.
2) Артыкулы прынятыя да друку падлягаюць скарачэньню й карэкце.

АДКРЫТЫ ЛІСТ УЛАДЫКУ МІКАЛАЮ

Дарагі Ўладыка:

Колькі ўжо абвінавачваньняў за апошнія 15 месяцаў Вы кінулі пад адрысам Яго Найпачасьнейшасьці Мітрапаліта Андрэя, а разам з Ім і на нас грэшных. А колькі цытатаў Апостальскіх Правоў, пастановаў Ўсяленскіх Сабораў і артыкулаў Статуту БАПЦ Вы прывялі каб пераканаць Вернікаў БАПЦ й Беларускую Грамадзкасьць аб тым, што Мітрапаліт і мы разам з Ім ламаем усе гэтыя Каноны, Правы й артыкулы. Паўтараю, што мы людзі грэшныя й у нашым простым розуме мы разумеем, што стоячы пры боку Мітрапаліта мы папросту баронім БАПЦ ад варожай дывэрсыі якая пачалася тут у ЗША амаль 20 год таму. А Вы дарагі Ўладыка з незразумелых для нас прычынаў падтрымоўваеце тых хто яўна, а яшчэ горш – з укрыцьця хоча зьнішчыць Яе.

Шматлікія з правілаў і пастановаў Ўсяленскіх Сабораў можа й не заўсёды ёсьць зразумелыя для нашага простага розуму, але мы добра разумеем адно найважнейшае. Божае Правіла якое даў нам сам Хрыстос, правіла каб мы не рабілі іньшым чагосьці, чаго не жадаем для нас саміх і галоўнае каб ня брудзілі сябе няпраўдай. Вы-ж Дарагі Ўладыка ня гледзячы на Ваш Высокі Сан часта папросту не заўважаеце гэтага правіла ў адносінах да сябе, а толькі бачыце калі нібы яго ламаюць іньшыя, і ў сваіх пасланьнях выпісваеце рэчы якія далёка разьмінаюцца з праўдай, або закідаеце іньшым тое ў чым Вы вінаваты самі. Вось хоць-бы ўзяць справу Суду: Вы абвінавачваеце Мітрапаліта Андрэя, што нібы ён падаў Яноўскага й яго прыхільнікаў у суд. А Вам-жа дасканала ведама, што у суд падалі а. Ян Бруцкі, я й група вернікаў, калі нас не дапусцілі ў Царкву.

Цяпер-жа, што да гэтага „абміньаньня" паводле Вашых слоў Царкоўнага Суду й шуканьня справядлівасьці ў сьвецкіх: А ці Вы забыліся тое калі Вы выступалі таксама перад судом у Брукліне і то ня раз, але два разы, у дзьвюх справах, а ў дадатку яшчэ будучы абвінавачваючай стараной, у адной з іх. Ведама можа Вы аб гэтым ужо забыліся, дык выбачце, што я Вам аб гэтым прыпамінаю. Аднак-жа з гэтага відаць, што Вы паступаеце паводле польскай пагаворкі: „Што можна ваяводзе то....".

Далей Вы пішаце, што „Парафія ў Гайлянд Парку была найлепш зыгранай парафіяй дзе быў супакой і парадак пакуль а. Бруцкі, будучы пэўным сябе, не пачаў зьневажаць Кіраўнічага Парафіі а. Александра Яноўскага, самавольна хрысьціць дзяцей і высьвячаць хаты. Потым знайшоўшы пару прыхільнікаў узяўся сілай выкідаць а. Александра Яноўскага з Парафіі"... і г.д. (гл. Пасланьне ад 20 травеня 1981).

А вось як выглядала „зыграная" па Вашаму Парафія: Хутка пасьля свайго прыезду ў Гайлянд Парк Яноўскі пачаў дзяліць парафіянаў на сваіх прыхільнікаў і іньшых. І тым апошнім пачаў пагражаць, што „я вас буду па адным перабіраць!". Пачаў слоўна зьневажаць харыстых у Царкве, абазваўшы двух з іх старэйшых ужо людзей аднаго „балдой", а іншаму сказаў, што ён паступае па „бальшавіцкаму". Жанчыне якая прасьпявала ў царкоўным хоры больш за 40 год заявіў, што „яна тут толькі перашкаджае й лепш было-б каб яна не прыходзіла на хор, а стаяла на доле". У 1974 годзе выкінуў з Царквы Амэрыканскі й Беларускі Сьцягі, а ў 1978 ахвяраваную парафіянамі да Сьв. Крыжа лампадку. Прагнаў з Аўтара прыслужнікаў – малых хлопцаў толькі затое, што яму не ўгадзілі іх бацькі.

Хто быў абражаным калі ў першых днях служэньня а. Яна Бруцкага Яноўскі заявіў яму, што ён „лезе не ў сваё карыта". На Вялікапосным чытаньні Канонаў Сьв. Андрэя Крыцкага, ён маніпуляваў так каб не дапусьціць да гэтага чытаньня а. Я. Бруцкага, што нават паклікаў да чытаньня недарослую дзяўчыну Т. Дубягу й Л. Стагановіча, а а. Бруцкі стаяў збоку.

У Вербную Нядзелю пасьля Сьв. Літургіі ў Аўтар зайшлі тры сябры Пар. Рады, Русак, Сільвановіч і Азарка якія пачалі рабіць закіды а. Бруцкаму, што нібы ён пачынае закалот у Царкве й нават пагражаць яму. Але калі той заўважыў, што тут ня месца на спрэчкі, яны вышлі. Калі-ж таго самага вечара на паседжаньні Пар. Рады а. Бруцкі запытаў іх, што можа яны ня ведаюць аб тым, што Аўтар зьяўляецца Сьвятым Сьвятых, Яноўскі іранічна запытаў: „а дзе ты гэта вычытаў?".

У Вялікі Чацьвер Яноўскі дазволіў а. Бруцкаму прачытаць з Дванаццаці Евангельляў толькі дзьве, а ў Вялікую Пятніцу не дапусьціў яго прагаласіць ані аднаго „Вовгласу", а ў часе Крэснага Ходу не дапусьціў яго й блізка да Плашчаніцы.

Цяпер-жа што да „самавольнага" паводле Вашых слоў хрышчэньня дзяцей і высьвячэньня хат. Здаецца ў праваслаўнай рэлігіі калі я ня мылюся, нікому не забаронена выбіраць сабе любога сьвятара якійбы адправіў над ім або над ягонымі дзяцьмі Таінствы паложаныя Царквою. А можа я мыляюся тады выбачце мне Ўладыка. Па другое й Вы Ўладыка таксама рукапалажылі сьвятара ў чужой Епархіі ня спытаўшы на гэтае згоды ў Кіруючага Епархіяй, дый нават не паведаміўшы яго перад гэтым. А гэта ўжо крыху больш чым ахрышчэньне дзіцяці. А што датыча высьвячэньня хат, то пачаў іх высьвячаць за год перад прыездам у Г.Парк а. Бруцкага, а. Расьціслаў Войтэнка. А здарылася гэтае таму, што Яноўскі каб неяк асабліва падкрэсьліць падзел парафіянаў на „лаяльных і нелаяльных" да яго, задумаў увесьці неякі ніколі дагэтуль не практыкаваны падпісны ліст, на якім-бы парафіяне складалі свае подпісы й нібы гэтым самым запрашалі яго ў свае хаты. Ці Вы Ўладыка спаткалі калісьці веруючага Беларуса якій-бы звычаем бацькоў і дзядоў чакаючы ў сваёй хаце сьвятара са Сьв. Вадой адмовіўся-б ад гэтай традыцыі? І вось дзеля гэтага, што ў гэтым быў сукрыты неякі тайны замысел Яноўскага, некаторыя з іх адмовіліся падпісаць гэты „цыраграф". А калі ў сувязі з гэтым Яноўскі не зьявіўся ў іх хатах яны былі змушаны прасіць зрабіць гэтае а. Расьціслава. На наступны год паўтарылася тая-ж самая камэдыя з падпісваньнем і тады а. Расьціслава замяніў а. Ян Бруцкі.

Пішучы аб тым, што а. Бруцкі „знайшоўшы сабе пару прыхільнікаў пачаў выкідаць Яноўскага з Парафіі", у гэтай трагэдыі Вы Ўладыка памяшалі актораў, бо здаецца ў дню 4-га травеня 1980 г. Яноўскі дырыгаваў з свайго акна калі ягоныя актывісты з другой стараны царкоўнай брамы крычэлі: „Не чапай, бачыш што зачынена!" або па расейску, „здраствуйце й дасьвіданія".

Далей у тым-жа самым пасланьні Вы пішаце што нібы Мітрапаліт казаў Вам, што „яму даносяць (папраўлена на перадаюць), што Яноўскі ня прызнае ЯпіскапатуБАПЦ высьмейвае ўсіх нас, а потым Мітрапаліт казаў яшчэ пра іншыя даносы..." А вось факты: Тыдзень перад славутым сходам „4 травеня 1980 г." Яноўскі на пропаведзі сказаў дасл оўна: „Калі няма князёў і каралёў то як і ў даўныя часы ўладу павінна ўзяць у свае рукі веча" – і таму заклікаў каб у наступную нядзелю ўсе зьявіліся на сход. На падмацаваньне сваіх слоў ён адчыніў трыманую пад пахай „Спадчыну" Я. Купалы й прачытаў пару першых зваротак вершу „На Сход". Цяпер скажыце Ўладыка, ці падобная дэмагогія ня ёсьць зьнявагай для Япіскапату? А таксама зьнявагай для Беларускага Народу й Вялікага Купалы калі ягоныя словы перакручваюць дзеля сваіх асабістых інтэрэсаў нясумленныя людзі будзь яны нават і сьвятары. А колькі разоў у размове з парафіянамі Яноўскі сьцьвярджаў: „а што там вашыя япіскапы ведаюць?"

Цяпер нас усіх цікавіць Дарагі Ўладыка чаму Вы ўсе скаргі на Яноўскага з лёгкай рукі акрэсьліваеце як *даносы*? А як назваць тое што выходзіць ад яго прыхільнікаў? Далей, як назваць мэту з якой Вы наведвалі Япіскапат УАПЦ? Ці з мэтай толькі таварыскай ветлівасьці?

Вось Вы Ўладыка заўсёды й усюды падкрэсьліваеце, што Вы не пасягаеце на ўладу Мітрапаліта, дык чаму Вы тады пры кожнай нагодзе ўспамінаеце Ягоны век (гл. Пасланьне ад 9 ліпеня 1981), Ягонае здароўе, а нават стаўляеце пад сумліў Ягоны розум, аб чым не прамінулі нават паведаміць і судовыя ўлады ад якіх Вы так рашуча адхрэшчываецеся.

Вы, хто так перасьцерагае ўсю „законнасьць" паседжаньняў і нарадаў якія адбываюцца ў згодзе з Вашымі думкамі й пажаданьнямі, але ці не маглі-б Вы хоць крыху ўдумацца ў гэтую законнасьць? Узяўшы хоць-бы для прыкладу гэты слынны й сёньня ўжо агульна ведамы сход ад 4-га травеня 1980 г., ці ў ім было хоць крышку законнасьці? Па першае, калі на ім мелі быць разгляданы такія прынцыповыя справы як перавыбары часткі Парафіяльнае Рады, а тымбольш пераход Парафіі ў іншую Епархію, то гэтыя пункты парадку дня павінны былі абвясьціцца ў паложаны тэрмін да ведама парафіянаў а не дапісвацца „на калені" ўжо ў часе сходу. Па другое, „перавыбары" былі праведзеныя пры адсутнасьці на сходзе самых „перавыбраных" сяброў Рады, а менавіта Старшыні, Заступніка Старшыні й Царкоўнага Старасты. А што менавіта ім закідалася, што іх трэба было перавыбраць у такім хуткім тэрміне. Яны-ж прабылі на сваіх пасадах крыху больш чым па два месяцы, бо былі выбраныя на Агульным Сходзе ў лютым таго-ж году.

У дадатку да гэтага была праведзена рэзалюцыя аб пераходзе пад Вашую апеку й ня гледзячы на важнасьць справы абвешчана аб гэтым у газ. „Беларус" паведамленьнем падпісаным „Парафіяльная Рада" як-бы гэта было паведамленьне аб нейкай малаважнай справе.

Але найцікавей выглядае тое, што ў гэтымжа дню праведзена пастанову каб пакрываць судовыя выдаткі з Царкоўнай Касы. І то калі справа была перададзена ў суд некалькі дзён пазьней. Дык, што Вы на гэтае Ўладыка? А можа на тым сходзе былі нейкія яснавідзячыя якія наперад прадбачаюць выпадкі. Пры сёньняшніх абставінах ўсё магчыма.

Вы пішаце, што Яноўскі ня мог быць пераведзены ў Кліўленд бо ён тут працуе на прадпрыемстве на сваё жыцьцё. Ці можна-б было запытацца ў Вас Ўладыка на якіх прадпрыемствах працуе большасьць нашых самаахвярных сьвятароў, а ў тым ліку й Вы асабіста. Дык адкуль такая ўвага да Яноўскага? Па другое, ён здаецца не зьяўляецца ніякім спэцыялістам каб мог працаваць па спэцыяльнасьці толькі ў акрэсьленым прадпрыемстве. А працу простага работніка можа-б ён знайшоў і ў іншым месцы. У сувязі з гэтым „зараблянем на жыцьцё" дык Вы здаецца былі забыўшыся аб ім звальняючы з пасады маючага на ўтрыманьні жонку й дзяцей а. Васілюка ў Дэтройце, калі на гэта зайшла патрэба. А таксама ня склікалі дзеля гэтага ніякіх нарадаў і не перадаючы справы ў Царкоўны Суд.

У Пасланьні ад 20 травеня Вы як заўсёды цьвердзіце, што Япіскап Ізяслаў падаў скаргу ў сьвецкі суд таму, што вернікі не хацелі прыняць яго за Кіраўнічага Парафіі. І тут Вы йзноў разьмінаецеся з праўдай, бо падаючы ў суд а. Ян Бруцкі ня быў яшчэ Япіскапам, а па другое, што ня вернікі, але тыя што падпаліся пад уплыў Яноўскага й збунтаваліся супроць распараджаньняў Першагерарха.

У кацы Вы йзноў успамінаеце грашовыя справы й налічылі аж 15 тысяч даляраў судовых выдаткаў. Кажу „ізноў" бо Вы ўжо раней рабілі безпадстаўныя закіды Сп. Войтэнку, Скарбніку Кансысторыі, што нібы ён бясправна аплачвае судовыя выдаткі з Касы Кансысторыі. На гэты Ваш закід ён у сваім часе здаецца даў Вам адказ. А сёньня я як Старшыня Парафіяльнай Рады заяўляю, што на судовыя выдаткі нашая старана не ўзяла ані з Касы Кансысторыі БАПЦ ані з якіхсь іншых царкоўных сумаў ані цэнта. Калі хтосьці выдаткаваў на гэта 15 тысяч даляраў то за іх ёсьць адказным толькі ён.

Безперапынна паўтараючы аб Царкоўным Судзе, Вы Ўладыка забываецеся адну кардынальную рэч, а менавіта: Калі Яноўскі не падпарадкаваўся ўжо ад некалькі год распараджэньням Першага Герарха а нават адказвае на іх у зьняважлівай форме (гл. копію ягонага ліста апублікаваную ў №31 часопісу *ЧАС* за травень 1981), толькі таму што гэтыя распараджаньні не падмацаваны зразумелымі для такіх людзей як ён санкцыямі, дык адкуль у Вас упэўненасьць, што ён падпарадкаваецца пастанове Царкоўнага Суду?

Што-ж датыча пісьмовых абвінавачаньняў супроць Яноўскага ў той Царкоўны Суд які вельмі сумліўна каб калісьці адбыўся, дык вось яны:

(1) Адразу пасьля прыезду пачаў дзяліць парафіянаў і ўвёў варожасьць паміж імі;

(2) Зьняважліва адносіўся й адносіцца да Першагерарха;

(3) Прылюдна зьняважаў і разганяў харыстых, а таксама тэрарызаваў папярэдняга дырыгэнта Хору сёньня ўжо Нябошчыка;

(4) Выкідаў з Царквы Сьцягі;

(5) Не дапусьціў у Царкву ахвяраваную парафіянамі да Сьв. Крыжа лампадку;

(6) Паміма існаваньня сыботняй школы не навучаў ані адно дзіцё нават такой простай рэчы як складаць пальцы пры знаку Крыжа, не кажучы ўжо аб малітвах ці чымсь большым;

(7) Не правёў ані аднае лекцыі для дарослых у якой растлумачыў-бы як яны маюць захоўвацца ў часе Багаслужбаў. Аднак гэта не перашкодзіла яму ў форме „шаптанай прапаганды" ўбіць у галовы сваіх прыхільнікаў, што станавіцца на калені ў часе сьпяваньня „Магутны Божа" ёсьць ня толькі непатрэбным, але нават і шкадлівым;

(8) Праводзіў зборку грашовых ахвяраў на карысьць бліжэй ня ведамай „згарэўшай" Царквы ў Польшчы, ня маючы на гэта ані дазволу Мітрапаліта, ані параузменьня з Пар. Радай. Згарэўшая Царква пазьней аказалася домам для сьвятара дый то здаецца на гэта няма ніякіх доказаў;

(9) Дазваляў удзельнічаць у Божых Службах бліжэй ня ведамым сьвятарам а.а. Якубу й Анатолію якім пазьней выплачваліся пэўныя сумы з парафіяльнай касы;

(10) Паміма выразнага загаду Першагерарха аб тым, што Сьв. Евангелія мае быць чытанае толькі па беларуску, ён пабачыўшы ў Царкве кагосьці чужога заўсёды чытаў па славянску.

Здаецца гэта ўжо досыць, хоць далёка яшчэ ня ўсё.

Дзеля таго, што Вы Ўладыка заўсёды паўтараеце, што для Вас „усе дарагія", я маю надзею, што Вы выбачыце й мне гэтыя горкія словы праўды адносна Вас і Вашых падапечных.

– *Віктар Лосік*
Старшыня Парафіяльнае Рады
Парафіі Жыровіцкае Божае Маці
Гайлянд Парк, Ню Джэрзі

Чужынцы Пішуць аб Закалоце...

УКРАІНСКАЯ ПРЭСА

Украінская газэта *Свобода* з дня 26 травеня 1981 г., зьверху, на першай бачыны, і ўкраінскі месячнік *Українське Православне Слово* №6 за чэрвень 1981 г. абодва надрукавалі той самы артыкул аб закалоце ў БАПЦ пад загалоўкам „Наступ на Беларускую Праваслаўную Царкву". Ніжэй *Беларускі ЧАС* перадрукоўвае гэты артыкул у беларускім перакладзе:

„Шырака заплянаваная й пасьлядоўна выконываная акцыя Масквы – сеяньне разладаў у цэрквах і грамадзкіх арганізацыях якія існуюць у вольным сьвеце выразна ўзмоцнілася ў апошніх гадох, месяцах і нават днях.

„Некалі дасьледчы гісторык перагладаючы пажоўклыя дакумэнты й часапісы ацэніць падзеі ў якіх сяньня мятушыцца і ў якіх траціць час і сілы нашая грамада. Тады выяўляцца тыя пружыны якія выкідаюць у гушчу эміграцыі паклёпы, паршэнты й рассяваюць разлад. Прыкладаў надта шмат. З іх можна ўспомніць разкладу УККА і выступы проціў царкоўных аўтарытэтаў і проціў Першагерарха Украінскае Праваслаўнае Царквы, Мітрапаліта Мсьціслава. Штораз выразьней выяўляюцца тыя скрытыя наступы Масквы на цэрквы ў расьсеяньні з мэтаю пазбавіць іх незалежнасьці. Найноўшы такі націск накіраваны на малалюднаю але ідэялягічна моцную Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву.

„Часапіс *Беларускі Голас* за травень 1981 г.... падкрэсьлівае, што цяперашні закалот у БАПЦ ёсьць адной з выяваў акцыі накіраванай на ліквідацыю БАПЦ. Пачалося з прысланьня ў Бруклін дыякана, якога скіраваў у БАПЦ япіскап Маскоўскага Патрыярхату. Здабыўшы гурток прыхільнікаў, гэты дыякан выявіў непаслушэнства да царкоўнага кіраўніцтва, ствараючы канфлікт у парафіі.

„Пасьля таго ў Царкву дастаўся сьвятар, які належаў да Амэрыканскае ПраваслаўнаеЦарквы якая ёсьць зьвязаная з Маскоўскім Патрыярхатам. Ягоныя намаганьні здабыць уплывовае становішча ў Беларускай Царкве не далі выніку й ён адыйшоў.

„Па калейцы, ў Царкву увайшоў прыбыўшы з Польшчы сьвятар які, здабыўшы прыхільнікаў сярод беларускай парафіі, распачаў акцыю супраць існуючага ў Царкве ладу й супраць царкоўнага кіраўніцтва. Да закалоту прычыніліся й адносіны Архіяпіскапа Мікалая які, знаходзячыся ў Канадзе, паставіўся прыхільна да дзеячаў разколу ў ЗША. Ягонае паступленьне выклікала асуджаньне іньшых герархаў БАПЦ, Мітрапаліта Андрэя й Япіскапа Ізяслава.

„Сеяньне разладаў – гэта ёсьць выпрабаваная зброя Масквы чыю руку можна бачыць у гэтым і ў падобных выпадках у іньшых цэрквах паза межамі свае бацькаўшчыны якія ня хочуць падпарадкавацца этаістычнай і шавеністычнай расейскай уладзе Маскоўскага Патрыярхату."

КАЗАКІ

Ліст да Ўладыкі Мітрапаліта

Ваша Высокапрэасьвяшчэнства!

З прысыланае мне Беларускае газэты „ЧАС", я даведаўся, што Вы дажылі да свайго юбілею 80-ці лецьця й з гэтае нагоды пасылаем Вам нашыя сардэчныя пажаданьні. З папярэдніх нумароў Вашых газэт, як і з „ЧАС"у №31, я даведаўся аб ганебных паступках Уладыкі Мікалая, што мяне страшна паразіла, а ўзапраўдасці абурыла. Я думаў, што ён стаўшыся Архіяпіскапам, пачне ўжо паводзіцца належна. Для мяне ведама, што й за часу сьв. пам. Ўладыкі Васіля, Уладыка Мікалай дазваляў сабе рабіць прыкрасьці Арх. Васілю а цяпер выступае й супраць Вас. Пытаньне чаго ён хоча й што робіць? Архіяпіскап Васіль быў яму ня добры, Мітрапаліт Андрэй так сама ня добры? Відавочна, што ён імкнецца быць Мітрапалітам – і потым разбурыць БАПЦаркву? Хто яго падаслаў і адкуль ён да Вас Беларусаў зьявіўся?

Дзякаваць Богу за тое, што адбылася хіратонія новага Япіскапа. Можа Бог дасьць, што гэты Япіскап будзе чэсным Вашым памочнікам, будзе дабрасумленна служыць БАПЦ й усяму Беларускаму Народу. Цалком спачуваю Вашаму Высокапрэасьвяшчэнству ў Вашай працы пры наяўнасьці такога „саўбрата" Арх. Мікалая. Гэта жудасы. Мне здаецца, што яго захаваньне спрычынілася й да таго, што нашыя Казакі ў Канадзе адыйшлі да іншае Беларускае Царквы, у чым навет не дапамаглі мае пісьмы ў якіх я належна высьвятляў справу. Падобныя паступы, як Архіяпіскапа Мікалая губяць нашае праваслаўе. Вось што азначае „свабода" для людзей без сумленьня й гонару ў якія-б тогі яны не адзяваліся, у Архірэйскія ці Генеральскія....

Дарэчы, як прыемна, калі пастыры і архіпастыры бываюць на вышыні свайго становішча. Ужо некалькі раз у пісьмах да мяне з Олдгам (Англія) наш Казак Іван Іванавіч Мартыненка ўспамінаў Вас Уладыка добрым словам!

З сардэчным прывітаньнем,
– *Ф. Бігдай з сям'ёю*
Рэдактар і выдавец журналу „Казачья Жизнь"

„ПЕСЬНЯ ПРА ЗУБРА” Міколы Гусоўскага

Поўны назоў гэтай слаўнай паэмы Міколы Гусоўскага такі: *Песьня пра выгляд, дзікасьць Зубра й паляваньне на яго.* Фактычна гэта аповесьць пра нашую гістарычную Дзяржаву – Вялікае Княства Літоўскае, якую ўканцы 18 ст. захапіла Расея, ды „Літвой”назвала гістарычную Жамойць, а нам накінула назоў „Беларусь”.

У мінулым 1980 г. *ЮНЭСКА,* адзначаючы гістарычныя заслугі нашага народу ў разьвіцьці сусьветнай культуры, уключыла побач Францішка Скарыны, нашага славутага першадрукара, і Міколу Гусоўскага ў каляндар вялікіх міжнародных датаў вялікіх дзеячоў славянскай культуры.

Творчая спадчына Гусоўскага адрадзілася зь мінулых стагодзьдзяў нядаўна, хоць ягоная паэма *Песьня Пра Зубра* была напісаная ў 1522 г. у тагачаснай мадэрнай лацінскай мове ды надрукаваная была ў 1523 г. ў Кракаве тыражом у 100 паасобнікаў. Адзін з выпадкова ацалелых экзэмпляраў быў падараваны настаяцелям Навадневіцкай Царквы Горадзенскай губ. Расейскаму Таварыству аматараў прыроды. У 1855 г. паэма была перавыдадзеная на той-жа лацінскай мове ў Пецярбурзе ў вельмі куртатым тыражы.

Другое перавыданьне *Песьні Пра Зубра* зьявілася ў 1896 г. ў Кракаве з падробнымі камэнтарамі польскага вучонага праф. Я. Пэльчара.

В. Дарашкевіч, літэратурны знаток беларускай старадаўнай літэратуры ў канцы 19 ст. пералажыў *Песьню Пра Зубра* на беларускую й расейскую мовы. У тым-жа самым часе зьявіліся пераклады *Песьні* на жамойцкую й украінскую мовы. Таксама ў канцы 19 ст. вялікія ўрыўкі *Песьні Пра Зубра* былі перакладзены на польскую мову Я. Каспровічам, які, высока ацаніў гэты твор, станоўка сьцьвярджаў, што Адам Міцкевіч, як аўтар паэмы *Пан Тадэвуш,* сваімі вытокамі паходзіць ад Міколы Гусоўскага.

Адам Міцкевіч выявіў у сваю эпоху найбольш удала спадчыну Гусоўскага. Ён перахапіў вельмі ўдала гэксамэтар *Песьні Пра Зубра* ды напісаў другую цудоўную „Песьню” *Пан Тпдэвуш* або апошні маскоўскі наезд на гістарычную Літву.

Як сьведчаць некаторыя крыніцы, Мікола Гусоўскі ў часе свайго побыту ў Рыме быў запрошаны на выкладчыка ў Балёнскім Унівэрсытэце, дзе атрымаў ступень прафэсара рыторыкі. Гэта ўскосна сьведчыць, што Мікола Гусоўскі атрымаў на свой час высокую адукацыю, магчыма ў Кракаўскім Унівэрсытэце, перад тым, як выступіў на міжнародную арэну.

Але будучы паэтам наўрад ці змог закончыць поўны курс навукі ў гэтым ці ў іншым унівэрсытэце. Такое меркаваньне стварае той факт, што ў рэктарскіх аналах выпусьнікоў і Ягелёнскага ды іншых унівэрсытэтаў таго часу імя Міколы з Гусава не ўспамінаецца. Іншая рэч, у гэтыя аналы ўносіліся адно імёны толькі тытулаваных сыноў і нашчадкаў тытулаванай знаці, а сыны „плепсаў” палясоўшчыкаў, дробных купцоў і рамесьнікаў такога гонару не ўдастойваліся. Магчыма прычына менавіта ў тым, што ў час пабыту свайго ў Італіі (1520–1522) Мікола з Гусава атрымаў на той час вышэйшую адукацыю. Але ці так, мы ня ведаем фактычных дакумантаў ды нават прыблізных дапушчэньняў.

Сам пясьняр, „лясны чалавек”, паляўнічы, ён сьціпла прызнаецца, як на споведзі, аддаўшыся ўспамінам пра мінулае, у гэткіх радках *Песьні*:

Што-ж да мяне, то свае паляваньні й ловы
Адпалявау я. Адзіная ўцеха ў самоце –
Жыць успамінамі. Думкай ляціш быстракрылай
Ноччу і днём на радзіму, у памяці сеці –
Вабіш той час незабыўны, што некалі ў нетрах
Родных лясоў разгубіўся, і кліч – не дакілічаш...
Гнаў тую думку: на людзях і сьмерць не страшная,
Колькі нягод паспытаў я на тых паляваньнях –
Каяцца-б можна, ды хто-ж каяўся ў мілым!
Быў і адважны, а дзе й неразважны, казалі:
Як ні было – не забыць свае школы Міколу...

Вось ён – і жыцьцёвы ўнівэрсытэт, і прафэсыйны досьлед-паэта, які ў сталыя гады трапляе ў сьвіту каралеўскага дыпляматы, былога полацкага япіскапа Эразма Цёлка-Віталіса ў Рым, ды пры зручным здарэньні расказа сябром папскай сьвіты повесьць пра свае паляўнічыя прыгоды.

Непасрэднай прычынай дзеля аповесьці была карыда – бой быкоў, якую дыпляматы разам з папай рымскім Львом Х Мэдычы глядзелі ў цырку. І там, на заўвагу кагосьці зь сяброў каралеўскай місіі аб тым, што бой быкоў нагадваў адважныя схваткі нас, Ліцьвіноў, з зубрамі ў сябе на радзіме, дзе Мікола Гусоўскі быў асабістым удзельнікам, там

...у сваім асяродзьдзі
Ён расказаў, што і ў нас у змаганьні зацятым
Гэткім-жа чынам адольваюць дужага зьвера...
Мне загадалі адразу-ж узяцца за працу,
Каб успаміны свае, пераліўшы ў гэкзамэтр вершаваны
Песьняй зрабіць і пра нас, і пра нашы аблавы...

Такім чынам Мікола Гусоўскі быў змушаны загадам свайго апякуна й пратэктара, пасла Эразма Вітэліўса з ВКЛ, „скласьці сваю песьню пра Зубра й родную краіну з багацьцем пушчаскага жыцьця ў ёй”.

Для Міколы з Гусава гэты загад стаўся творчым высілкам прадставіць Заходняй Эўропе сваю краіну зь яе багатым жывёльным сьветам, але паказаць яе значна глыбей і шырэй – з усім хараством ды багацьцем яе першабытнай прыроды, зь яе насельніцтвам і бытам, зь яе філязафічнымі й палітычнымі поглядамі грамадзтва таго часу.

Была яшчэ ў яго запаветная мара – зьвярнуць увагу прадстаўнікоў краін Захаду на цяжкае ваенна-палітычнае становішча сваёй краіны, што была фарпостам краін Захаду перад наваламі полчышчаў Арды, Татараў ды Туркаў у глыб Эўропы.

Але гэтую мару ён выявіў пад канец *Песьні,* пасьля дастойнага прадстаўленьня сваёй маловедамай краіны Заходняй Эўропе. Ён сьціпла прызнаецца:

Тут, удастоены гонару большага – і небясьпекі,
Мабыць, не менш, – я прыхапкамі авалодаць
Мушу нязвычнаю зброяй: той самай рукою,
Што налаўчыліся лукам расьпісвацца, трэба
Умельства сваё праявіць і ў мастацтве прыгожым.

Калі-б пасол, пратэктар і апякун паэты, дыплямат і дзяржаўны дзеяч, сумняваўся ў здольнасьцях і таленце свайго выхаванка, ён не даручыў-бы яму такога адказнага заданьня, тым больш, што закашчыкам быў сам папа рымскі Леў Х Мэдычы, ня толькі галава каталіцкай Царквы, але й знаток ды апякун усіх жанраў мастацтва эпохі позьняга Адраджэньня.

Каралеўскі пасол аддаваў загад свайму сакратару, вялікаму паэту, вялікаму самародку Вялікага Княства Літоўскага. І ў гэтым быў таксама дыпляматычны разьлік: задзівіць Заходнюю Эўропу адкрыцьцём малавядомага ёй пушчанскага Краю – Вялікага Княства Літоўскага „пад зоркай Палярнай” ды талентам усходня-славянскага Вэргілія, Гарацыя ці Петраркі.

Як-жа сам япіскап Эразм Цёлак, які да таго часу, калі стаўся лацінізаваным япіскапам Вітэўлісам, узначальваў нейкі час вялікакняжскую канцылярыю ў Вільні, адкрыў для сябе „між паэтаў” часовага абраньніка, Міколу Гусоўскага. Вось што ён сам кажа ў *Песьні:*

Сьвет даўніны вывучаў я па кнігах славянскіх–
Граматах рускіх, кірыліцай пісаных вязкіх.
Лад альфавіту наш прашчур для ўласнай карысьці
У грэкаў пазычыў і, гукі мясцовых гаворак
Зладзіўшы зь ім, іншаземцам, застаўся сабою...

Атрымаўшы пачатковую й вышэйшую адукацыю, Мікола Гусоўскі разам з бацькам часта перабіраецца з аднаго месца ляснол службы на другое і, магчыма, трапляе ў заходнія ўдзельныя княствы ВКЛ бліжэй да Турава, Навагрудку ды Вільні. У тыя-ж яшчэ маладыя гады ён, высока адукаваны юнак з талентам паэты, трапляе ў адну з каралеўскіх канцылярыяў. Там „дасужага на ловах ды кемлівага на слова” заўважаюць мэцэнаты й дапамагаюць кемліваму „палясоўшчыку” дастаць палітычную працу ў вялікакняжскай канцылярыі ў Вільні. У той час гэтую важную ўстанову ўзначальваў япіскап з Полацку Эразм Цёлак. Ён і даў вялікую свабодную дарогу для Міколы Гусоўскага, які быў нейкі час асабістым сакратаром у яго.

Такім чынам Мікола Гусоўскі, трапіўшы ў „вечны горад, на зямлю апэнінскаую”, быў захоплены з палітычных дасягненьняў. Ен выказаўся з палётам:

О праявіся з пад раскі вадой жыватворнай
І ўскаласі маё першае семя на добрае племя!

Пасьля ўсьведамляў ён, якая вялізная місія ўскладаецца на яго: першаму ад імя ВКЛ перад „адукаванай Эўропай” пасеяць свае паэтычнае слова, як „першае семя на добрае племя”. І ён пасеяў...

Сучасныя дзеячы й культурнікі, як сьведчыць В. Дарашкевіч, імкнуліся да таго, каб вялікія гістарычныя дасягненьні нашага народу выявіць ды запісаць у культурным каталёгу *ЮНЭСКА,* каб сучасны сусьвет паважаў ды бараніў усе культурныя дасягненьні ўсяго глебу.

Папулярызацыя ў *Песьні Пра Зубра* гісторыі й культуры ВКЛ у наш час на сусьветнай арэне – гэта й у нашыя дні не траціць сваёй актуальнасьці дзеля маскоўскага паняволеньня.

Стогне ў цемраці ночнай, зьлавесны народ наш,
Вобмацкам волі шукае... Жахлівыя зьдзекі
Церпіць пакутнік пад страшным прыгнётам чужынца...
Мы шчэ натоўп, грамада недасьведчаная, цёмна...
Князь і баяры – усе, каму трэ заступіцца,
Глухія да нас, і ня лепш, чымся жорсткі татарын,
Душаць пятлёй галасы абурэньня ў нардзе...

І ў гэтым сэнсе твор Гусоўскага *Песьня Пра Зубра* ёсьць надзвычайным помнікам нашай вялізнай літаратурнай спадчыны ды паказальнікам нашай нацыянальнай культуры.

- В. Пануцэвіч

Жыцьцяпіс

(працяг з 3-й бачыны)

З пачаткам бягучага году Ўладыку Андрэю споўнілася 31 годзьдзе Ягонае службы Богу, Народу й Бацькаўшчыне!

З гэтае-ж нагоды мы ўсе тут прысутныя на Абедзе Ўдзячнасьці ад шчырага сэрца перасылаем нашыя найшчырэйшыя пажаданьні ў здароўі, жыцьці ды працы на многія лета!

– Я. Калбаса
Ад імя Парафіяльнае Рады
ў Брадфорд, Англія